**УДК 262.2** **DOI 10.52928/978-985-531-917-8-2025-124-129**

## РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЯ ПАРАФІЯ Ў ПОЛАЦКУ (1772–1917 гг.)

***Ю. А. АЎСЕЙЧЫК***
***(Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Беларусь)***

*У артыкуле разгледжаны асноўныя аспекты развіцця рымска-каталіцкай парафіі ў Полацку ў часы Расійскай імперыі. Вылучаны асноўныя аспекты дзейнасці духавенства, прааналізавана структура і колькасць вернікаў. Асноўнымі крыніцамі для даследавання сталі архіўныя дакументы і штогоднія выданні Каталіцкага Касцёла – дырэкторыумы.*

***Ключавыя словы:*** *Полацк, парафія, святар, пробашч, кляштар, дамініканцы, мошчы, душпастырская дзейнасць, дабрачыннасць.*

## РИМСКО-КАТОЛИЧЕСКАЯ ПАРАФИЯ В ПОЛОЦКЕ (1772–1917 гг.)

***Ю. А. ОВСЕЙЧИК***
***(Национальный Полоцкий историко-культурный музей-заповедник, Беларусь)***

*В статье рассмотрены основные аспекты развития римско-католической парафии в Полоцке времен Российской империи. Выделены основные аспекты деятельности духовенства, проанализирована структура и количество верующих. Основными источниками исследования стали архивные документы и ежегодные издания Католического Костела – директориумы.*

***Ключевые слова:*** *Полоцк, парафия, священник, пробащ, кляштар, доминиканцы, душпастырская деятельность, благотворительность.*

## ROMAN CATHOLIC PARISH IN POLOTSK (1772–1917)

***Y. AUSEICHYK***
***(Polotsk National Historical and Cultural Museum-Reserve, Belarus)***

*The article examines the main aspects of the development of the Roman Catholic parish in Polotsk during the Russian Empire. The main aspects of the clergy's activities are highlighted, the structure and number of believers are analyzed. The main sources for the research were archival documents and the annual publications of the Catholic Church, the directoriums.*

***Keywords:*** *Polotsk, parish, priest, abbot, monastery, Dominicans, relics, pastoral work, charity.*

Першая структурная адзінка каталіцкай царквы на беларускіх землях была створана 17 лютага 1387 г. – Віленскае біскупства, якое ахоплівала і Полацкую зямлю. Актыўную місіянерскую дзейнасць на Полаччыне пачалі праводзіць прадстаў-

нікі розных манаскіх рымска-каталіцкіх ордэнаў. У 1498 г. быў заснаваны кляштар бернардынцаў, а ў 1580 г. па запрашэнні Стэфана Баторыя ў горад прыбылі езуіты. Кляштар дамініканцаў паўстаў у другой палове XVII ст., а дамініканскі касцёл Маці Божай Ружанцовай стаў цэнтрам Полацкай парафіі. У XVIII ст. яна ўваходзіла ў склад полацкага дэканата, які, у сваю чаргу, быў часткай Віленскай дыяцэзіі.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай частка полацкага дэканата, якая знаходзілася на правым беразе Заходняй Дзвіны, апынулася ў складзе Расійскай імперыі. Асаблівасцю падзела стала тое, што полацкі дэканат быў як у Расійскай імперыі, так і ў Рэчы Паспалітай, з той толькі розніцай, што цэнтрам парафіі і дэканата на тэрыторыі канфедэрацыі былі Ушачы, а імперыі – Полацк. У 1773 г. была створана Беларуская дыяцэзія, з 1782 г. пераіменаваная ў Магілёўскую, у склад якой і ўваходзіў полацкі дэканат. На працягу наступнага стагоддзя фарміраваліся тэрытарыяльныя межы Полацкай рымска-каталіцкай парафіі.

Важнымі падзеямі, якія паўплывалі на стан каталіцкага касцёла ў Полацку сталі тры падзелы Рэчы Паспалітай, паўстанні 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг. Так, пасля паўстання 1863 г. былі выгнаны айцы дамініканцы і з 1864 г. у Полацкай парафіі пачалі працаваць дыяцэзіяльныя святары. У канцы XVIII ст. у Полацку існавала адна рымска-каталіцкая парафія, якую абслугоўвалі прадстаўнікі дамініканскага ордэну. Чаму менавіты дамініканцы – невядома, бо на той перыяд, акрамя іх, у Полацку працавалі бернардынцы, францысканцы, езуіты. У 1804 г. дамініканцамі быў пабудаваны новы храм на цэнтральнай плошчы пад тытулам Маці Божай Ружанцовай, які і стаў парафіяльным касцёлам. На працягу 1822–1830 гг. парафіяльнай працай у Полацку займаліся айцы піяры [15, s. 174]. А з 1830 гг. парафія была вернута прадстаўнікам Ордэну прапаведнікаў.

Дамініканцы Літоўскай правінцыі, у склад якой уваходзіў з самага пачатку і полацкі канвент, займаліся душпастырскай і місіянерскай працай. У асноўным полацкія дамініканцы ў парафіі выконвалі душпастырскія абавязкі [1, с. 4]. Да полацкай парафіі ў першай палове XVIII ст., акрамя касцёла Маці Божай Ружанцовай, адносіліся касцёлы Св. Пятра і Паўла, Св. Крыжа, Гроба Гасподня [2, с. 173], таму айцы з Ордэна прапаведнікаў павінны былі абслугоўваць і іх. Акрамя храмаў парафіі, душпастырская дзейнасць дамініканцаў ахоплівала публічныя і дамавыя капліцы.

У склад Полацкай парафіі ўваходзіла не толькі тэрыторыя горада, але і наваколіцы. Як слушна адзначае Д. Банчкоўскі, значная частка вернікаў знаходзілася на вялікай адлегласці ад горада, да некаторых хворых, каб удзяліць ім патрэбныя сакрамэнты, дамініканцам прыходзілася ездзіць па 45 вёрст і болей, таму што Полацкая парафія складалася са скасаваных прыходаў [18, s. 391]. Полацкая парафія была галоўнай у складзе полацкага дэканата, а дэканат, у сваю чаргу, уваходзіў у склад Магілёўскай архідыяцэзіі. Як правіла, полацкі пробашч адначасова выконваў функцыі полацкага дэкана. Згодна з даследаваннем А. Л. Грывянёва, толькі ў 1845–1849 гг. полацкі пробашч, на той момант ім быў дамініканец В. Вяржхоўскі, падпарадкоўваўся віцебскаму дэкану [2, с. 169].

Дамініканцы ў парафіі займаліся і дабрачыннай справай, пра што сведчыць існаванне ружанцовага брацтва[16] пры касцёле Маці Божай Ружанцовай. Вядома, што ў 1853 г. пры брацтве існавала багадзельня [2, с. 170].

[16] Ружанцовыя брацтвы – згуртаванні альбо таварыствы вернікаў, якія аб'ядноўваліся ў рэлігійных або дабрачынных мэтах і былі афіцыйна зацверджаныя касцёлам)

Адметнай рысай працы дамініканцаў у Полацкай парафіі быў высокі ўзровень музычнага прыстасавання ў малітоўных набажэнствах. Так, ужо на пачатку XIX ст. у полацкім храме быў усталяваны 12-галосны арган, пра што сведчыць даследаванне Т. Ліхач [4, с. 6].

З 1864 г. у Полацкай парафіі пачалі працаваць дыяцэзіальныя святары. Гэта адмоўна паўплывала на дзейнасць парафіі. Калі працавалі прадстаўнікі Ордэну прапаведнікаў, то яны маглі выканаць больш працы, бо іх колькасць была значна большай, чым звычайных святароў. Як вынікае з архіўных матэрыялаў, у 1845 г. у кляштары дамініканцаў, які знаходзіўся побач з парафіяльным касцёлам Маці Божай Ружанцовай у Полацку, працавала 15 братоў-прапаведнікаў (13 айцоў, якія маглі выконваць святарскія абавязкі і 2 манахі – Буткевіч Х., Сініцкі Ф.) [5]. Так, у 1876 г. у Полацку працавалі толькі 3 дыяцэзіяльныя святары: Карл Сініцкі, магістр багаслоўя, выконваў функцыі полацкага дэкана, а тым самым, хутчэй за ўсё, з'яўляўся і пробашчам парафіі ў Полацку; вікарый – Іосіф Сініцкі, магістр багаслоўя; Ян Валінскі – законавучыцель [16, с. 117].

У другой палове XIX – пачатку XX ст. колькасць вернікаў Полацкай парафіі павялічваецца. Як вынікае з матэрыялаў дырэкторыумаў, у 1860 г. полацкая парафія налічвала 4630 вернікаў [14, s. 91], у 1877 г. – 5028 [16, с. 117], у 1897 г. – 5267 [12, с. 187], у 1912 г. – 7215 [13, с. 176].

У 1865 г. на пасаду пробашча ў Полацкую парафію быў прызначаны Вінцэнт Юркевіч, які да канца жыцця заставаўся ў Полацку. Так, згодна з матэрыяламі Памятнай кніжкі Віцебскай губерні, на 1907 г. эмерытам[17] пазначаны В. Юркевіч [6]. На працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. функцыі пробашча Полацкай парафіі выконвалі: кс. Юркевіч, кс. Дзеражынскі, кс. Сяніцкі, кс. Валінскі, кс. Ваяводскі, кс. Батура, кс. Бараноўскі [2, с. 171].

Значнай асобай на пасадзе полацкага пробашча быў Леанард Бараноўскі. Нарадзіўся ён у 1875 г. у Віцебскім павеце, скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію. У 1900 г. атрымаў святарскія пасведчанні, працаваў вікарыем касцёла Св. Кацярыны ў Пецярбургу. З 1909 па 1914 г. выконваў функцыі пробашча ў Полацку. Згодна з дырэкторыумам за 1912 г., Л. Бараноўскі выконваў і абавязкі дэкана полацкага [13, s. 176]. Пасля пажару 1912 г., Бараноўскі займаўся рамонтам храма [18, s. 392].

Акрамя Л. Бараноўскага, у 1908–1912 гг. у полацкім касцёле працаваў кс. Францішак Будзька, які выконваў функцыі вікарыя. Важным у служэнні Будзькі было тое, што свае казанні ён прамаўляў па-беларуску. Будзька апекаваўся не толькі галоўнай святыняй парафіі, але і даяжджаў да іншых касцёлаў, дзе не было святара. Так, 23 вярсты ад Полацка знаходзілася мясцовасць Шацілава, калісьці асобная парафія. Налічвала яна 8 вёсак каталіцкіх вернікаў і 3 двары. Набажэнствы адпраўляліся ў звычайнай вясковай хаце. Менавіта, Ф. Будзька распачаў працу, звязаную з будоўляй новага храма [18, s. 392–393; 2, с. 173–174]. Важнай была і перакладчыцкая праца полацкага вікарыя. У 1911 г. у Вільні выйшла кніга Яна Урбана «Бл. Андрэй Баболя», якую пераклаў на беларускую мову Ф. Будзька, «на выбар тэмы, відаць паўплывала месца служэння» [11].

У 1916 г. Ф. Будзька вяртаецца ў Полацк і набывае невялікі фальварак у вёсцы Янатруда. Першапачаткова месцам для правядзення набажэнстваў была абрана драўляная хата. Будзька хацеў пабудаваць касцёл у нацыянальным стылі па праекту

[17] Эмерыт – тытульнае абазначэнне для святароў, якія ў сувязі з паважным узростам вызваленыя ад большасці сваіх службовых абавязкаў, але працягваюць выконваць некаторыя з іх.

архітэктара Лявона Вітан-Дубейкаўскага, а матэрыяльныя сродкі атрымаць ад княгіні Магдалены Радзівіл. Адметнасцю такога касцёла, на думку С. Харэўскага, было тое, што ён мог бы служыць прататыпам храма і для каталікоў, і для праваслаўных, і для пратэстантаў [10, с. 47].

Важным накірункам дзейнасці полацкага духавенства была праца ў навучальных установах горада. Так, у дырэкторыуме за 1860 г. адзначана, што прадстаўнік Ордэна прапаведнікаў – Фелікс Зялёнка – Capellan. Scholae District [14, s. 91], у 1877 г. і 1885 г. – законавучыцелем Ваеннай Гімназіі пазначаны Ян Валінскі [16, с. 117; 17, с. 158]. У дакументах за 1897 г. і 1901 г. наконт адукацыйнай працы ў навучальных установах няма даных, а ў 1912 г. рымска-каталіцкае духавенства працавала ўжо ў двух: Corpus Cadeticum (Кадэцкі Корпус) і Gymnas.puellar (хутчэй за ўсё, гэта Полацкая жаночая гімназія) [13, s. 176]. У жаночай гімназіі выкладаў Закон Божы сам пробашч парафіі Маці Божай Ружанцовай – Леанард Бараноўскі [7, с. 197].

На працягу існавання Полацкай парафіі ў складзе Расійскай імперыі адной з самых вялікіх цяжкасцей было пераадоленне перашкод ад пажараў. Храм, які належаў дамініканцам, першапачаткова быў драўляны. І толькі пасля чарговага пажару ў 1804 г. была пабудавана каменная святыня. Пра добрыя адносіны паміж прадстаўнікамі розных рымска-каталіцкіх ордэнаў у Полацку сведчыць той факт, што дамініканцам у XVIII ст. і пачатку XIX ст. ліквідаваць наступствы вогненнай стыхіі дапамагалі езуіты. Аднак агонь знішчаў не толькі храм, але і кляштарныя будынкі. Так, у 1843 г. жыхары Полацка – Плаўлінскі і Сіндэрс, спалілі дамініканскі кляштар [8, с. 270]. Пасля пажара ў 1871 г. зноў прыйшлося аднаўляць касцёл і плябанію[18] [18, s. 392]. Зразумела, што наступствы пажараў ліквідаваліся за сродкі духавенства, вернікаў і ахвярадаўцаў. Матэрыяльна дапамагалі: віленскі біскуп А. Сапега, землеўладальнік Я. Хржаноўскі, памешчыкі Кляпацы, княгіня Нясвіцкая, тытулярны саветнік П. Дзімітра-Саульскі, падпалкоўнік Вярыга, генеральша Мурахіна, адстаўны паручнік Бужынскі, генерал-маёр А. Свалынскі, княжна Л. Святаполк-Мірская і іншыя [2, с. 172].

Значным фактарам развіцця Полацкай парафіі была наяўнасць машчэй Андрэя Баболі пры касцёле Маці Божай Ружанцовай. Першапачаткова астанкі святога былі перанесены езуітамі ў касцёл св. Стэфана. А калі ў 1831 г. езуіцкі касцёл перайшоў да праваслаўных, мошчы перанеслі ў дамініканскі касцёл, дзе яны захоўваліся да 1922 г. Згодна з даследаваннем Н. Сяргеенкі, у касцёле Маці Божай Ружанцовай была «зроблена асобная крыпта ў выглядзе капліцы. З касцёла ў капліцу вёў зручны для вернікаў ход. У крыпце касцёла ў цэнтры, на ўзвышшы стаяла адкрытая труна, у якой пад пруцяной сеткай знаходзіліся мошчы Андрэя Баболі. Цела было пакрытае адзеннем чырвонага колеру. Сама крыпта была ўпрыгожана чорным аксамітам, на які прымацоўвалі маленькія абразы ці іншыя дары, якія вернікі прыносілі да Баболі» [8, с. 269–270]. З распаўсюджваннем культа пакланення машчам Андрэя Баболі, павялічвалася праца ў парафіі для каталіцкага духавенства і свецкіх людзей. У другой палове XIX ст. працэсіі ў горадзе былі забаронены, а вось з прыняццем закону аб верацярпімасці ў 1905 г. адраджаюцца пілігрымацыі да машчэй. Папа Пій IX у 1853 г. правёў беатыфікацыю Андрэя Баболі, а дзень успаміну абвяшчаўся на 23 мая паводле старога стылю. Так супала, што ў гэты ж дзень палачане ўшаноўвалі памяць Еўфрасінні Полацкай. «Хрэсныя ходы з Двінска, якія пачыналіся 16–17 мая, збіралі шмат каталіцкіх вернікаў у пілігрымку. У Полацк 23 мая прыбывала ад 20 да 30 тыс.

[18] Жылы дом каталіцкага святара з гаспадарчымі пабудовамі, які звычайна быў размешчаны каля касцёла.

паломнікаў, праваслаўных і каталікоў. Каталіцкія працэсіі адрозніваліся пышнасцю і мнагалюднасцю» – адзначае Сяргеенка Н. А. [9, с. 191–192]. Мошчы Еўфрасінні былі перанесены ў Полацк, каб супрацьстаяць распаўсюджанню культу Андрэя Баболі, якому хадзілі пакланяцца і праваслаўныя вернікі, аб чым сведчыць «одной изъ весьма важныхъ и необходимыхъ, мѣръ борьбы съ католичествомъ въ сѣверо-западномъ краѣ перенесеніе мощей преподобной Евфросиніи изъ Кіева въ Полоцкъ» [3, с. 61].

Важным аспектам у Полацкай парафіі была і дабрачынная праца, якая звязаная не толькі з прадстаўнікамі Ордэна прапаведнікаў, але і з дыяцэзіяльнымі святарамі. Прыкладам такой дзейнасці было заснаванне ў пачатку XX ст. рымска-каталіцкага Дабрачыннага таварыства. Вядома, што ў 1910 г. старшынёй дадзенай арганізацыі была Леонція Львоўна Івашэўская, а яе намеснікам – Яўген Рашкоўскі [7, с. 208]. Пры таварыстве існаваў дзіцячы прытулак на 150 месцаў з магчымасцю асвоіць за трохгадовы курс навучання кравецкае рамяство, дзейнічала бібліятэка [18, s. 393].

Такім чынам, Полацкая парафія на працягу XIX – пачатку XX ст. колькасна павялічвалася. Асноўнымі відамі працы каталіцкага духавенства былі адукацыйная, душпастырская, дабрачынная і місіянерская. Душпастырская праца пасля паўстання 1863 г. не магла быць настолькі вялікай, бо значна скарацілася колькасць святароў, замест дзясятка дамініканцаў абслугоўваць насельніцтва пачалі некалькі дыяцэзіяльных святароў. Сацыяльная праца праводзілася як прадстаўнікамі Ордэна прапаведнікаў, так і звычайнымі святарамі: дамініканцы заснавалі і развівалі ружанцовае брацтва, дыяцэзіяльныя ксяндзы – Дабрачыннае рымска-каталіцкае таварыства. У пачатку XX ст. у Полацкай парафіі ў пропаведзях падчас набажэнстваў выкарыстоўваецца беларуская мова. Значную ролю ў распаўсюджванні роднай мовы сярод вернікаў адыграў вікарый полацкага касцёла Маці Божай Ружанцовай – Ф. Будзька.

## ЛІТАРАТУРА


1. Аўсейчык, Ю. А. Ордэн Дамініканцаў у Полацку (канец XVIII – сярэдзіна XIX стст.) / Ю. А. Аўсейчык // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: па выніках навукова-даследчай работы супрацоўнікаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ў 2023 г., Полацк, 29 лют. 2024 г. / Гродзен. дзярж. ун-т імя Янкі Купалы, Нац. Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік; уклад. Т. У. Явіч. – Гродна : ГрДУ, 2025. – С. 4–8.
2. Грывянёў, А. Л. Полацкі касцёл Святога Ружанца і яго парафія ў другой палове XVIII – пачатку XX ст. (па матэрыялах НГАБ) / А. Л. Грывянёў // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. – Мінск, 2012. – Вып. 10. – С. 168–187.
3. Жизнь и подвиги преподобной Евфросинии Полоцкой. – М. : Тип. т-ва И. Д. Сытина, 1910. – 108 с.
4. Ліхач, Т. Ордэн дамініканцаў і развіццё музычнай культуры Беларусі / Т. Ліхач // Наша вера. – № 2(12). – 2000. – С. 34–41.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2818. Воп. 1. Спр. 1.
6. Памятная книжка Витебской губернии на 1909 год : издание официальное / Витеб. Губерн. Стат. комитет. – Витебск : Губ. тип., 1909. – URL: https://text.pskovbook.ru/ProtectedView/App/Viewer (дата обращения: 06.01.2025).
7. Памятная книжка Витебской губернии на 1912 год : издание официальное. – Витебск : губ. тип., 1912. – URL: https://rusneb.ru/catalog/000200_000018_v19_rc_1345178/?ysclid=mf8bbl6ilv216783502 (дата обращения: 06.08.2025).
8. Сяргеенка, Н. А. Барацьба за мошчы. 114 гадоў сьвятога Андрэя Баболі ў Полацку / Н. А. Сяргеенка // ARCHE Пачатак. – 2011. – № 5. – С. 269–279.

9. Сяргеенка, Н. А. Мошчы святога Андрэя Баболі ў Полацку / Н. А. Сяргеенка // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі: (да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея) / уклад. В. Д. Краско. – Полацк : НПГКМЗ, 2008. – С. 189–197.
10. Харэўскі, С. В. Культавае дойлідства Заходняй Беларусі 1915–1940 гг. / С. В. Харэўскі. – Вільня : ЕГУ, 2008 – 102 с.
11. Шыталь, К. Ксёндз Францішак Будзька – забыты беларусізатар Касцёла // К. Шыталь. – URL: https://catholicnews.by/ksyondz-frantsishak-budz-ka-zaby-ty-belarusizatar-kastsyola/. (дата обращения: 28.12.2024).
12. Directorium divini officii et missarum pro Archidioecesi Mohyloviensi nec non Ecclesiis Minscensi in annum Domini 1897. – Вильно : Тип. Іосифа Завадзкаго. – S. 270.
13. Directorium divini officii et missarum pro Archidioecesi Mohyloviensi nec non pro Minscensi in annum Domini bissextilem 1912. – СПб.: С.-Петерб. Губ. Тип. – S. 172.
14. Directorium Horarum Canonicarum et missarum pro Archidioecesi Mohyloviensi in annum Domini MDCCCLXI. – Vilnae : Typis Josephi Zawadzki, 1860. – S. 136.
15. Giżycki, J. M. A. Wiadomości o Dominikanach prowincji litewskiej / Zebr. Wołyniak; Poprzedził przedm. O. Woroniecki. – Kraków : nakl. OO. Dominikanów, 1917. – 320 s.
16. Ordo divini officii et missarum pro Archidioecesi Mohyloviensi in annum Domini 1877. – Petropolis, 1876. – S. 153.
17. Ordo divini officii et missarum pro Archidioecesi Mohyloviensi in annum Domini 1885. – п.ф. Осипа Завадзкаго. – S. 231.
18. Nasze kościoly: [opis ilustrowany wszystkich kościołów i parafji znajdujących się na obszarach dawnej Polski i ziemiach przyległych] / ułożyłi: Dyonizy Bączkowski, Jozafat Żyskar. – Warszawa Petersburg : Piotr Laskauer Pietkowski, 1913. – 443 s.